# Папяровыя дзівосы

## Як талент, нажніцы і папера стварылі гісторыка-культурную каштоўнасць Беларусі



Выцінанка «Адзінства» Вольгі Налівайка (Мінск). 2022 год

**У гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вельмі незвычайны лёс. Былі ў ім перыяды папулярнасці і поўнага забыцця, зорны час імклівага ўзлёту. У сучасны побыт выцінанка ўвайшла так арганічна, што часам мы нават не заўважаем яе прысутнасці, але на нейкім неўсвядомленым узроўні ўпэўнены: гэта сваё, беларускае. Тое, што можа быць складнікам не толькі нацыянальнай, а і сусветнай культурнай спадчыны.**

### Як рука павядзе

Сялянская праца ва ўсе часы – рабіць-не перарабіць. Але, нягледзячы на неймаверную колькасць спраў і абавязкаў, добрая гаспадыня знаходзіла час і для творчасці. Хаця б пад свята і на самае простае: возьме нажніцы і паперу, складзе ў некалькі разоў аркуш і дасць волю ўласнай фантазіі. А рука сама павядзе – пачне выразаць фігуркі анёлаў, пеўняў ці галубоў, ажурныя карункі з немудрагелістымі кветкамі-лісточкамі ды ромбамі-кружочкамі. І вось ужо яны красуюцца на папяровых сурвэтках і фіранках, упрыгожваюць хату, ствараюць святочную атмасферу…

Для звычайных беларусаў папера ў канцы XIX стагоддзя стала больш даступнай. У гэты час з'яўляецца ў побыце і ажурная, адмысловая выразка, якую ведаем як выцінанку. У залежнасці ад рэгіёна бывалі розныя назвы: выразанка, выстрыганка, выбіванка. Карункамі з белай, чорнай і каляровай паперы гаспадыні аздаблялі вокны, сцены, паліцы, абразы, люстэркі, куфры. Распаўсюджана ў той час выцінанка была і ў нашых суседзяў – у Літве, Польшчы, Украіне, таму не абышлося без культурных узаемаўплываў. Але кожная майстрыха міжволі душою адчувала мясцовыя адметнасці, характэрныя і для іншых відаў народнай культуры, што адбівалася і на выцінанцы.

Яе сусветная гісторыя мае больш глыбокія карані, і звязаны яны з вынаходніцтвам паперы ў старажытным Кітаі, дзе ажурныя выразкі папранейшаму захоўваюць традыцыйную стылістыку. З Персіі і Турцыі звычай выразаць з паперы прыкладна ў XV стагоддзі трапіў у Італію і паступова распаўсюдзіўся далей.

Цікава, што выцінанка ў знаёмым нам выглядзе больш прыжылася ва Усходняй Еўропе і дагэтуль застаецца адным з відаў народнай культуры ў Беларусі, Украіне, Польшчы, Славакіі, Літве, а таксама ў некаторых рэгіёнах Расіі. А вось у Францыі, Германіі, Англіі і іншых краінах Заходняй Еўропы былі больш папулярныя сілуэты – партрэтныя адлюстраванні або сюжэтныя кампазіцыі пераважна з чорнай паперы. Назву яны атрымалі ад імя французскага фінансіста Эцьена Сілуэта – майстра перакройваць дзяржаўны бюджэт і прыхільніка выразаных партрэтаў замест дарагога жывапісу. Ад французаў моду на мініяцюрныя сілуэтныя партрэты і кампазіцыі пераналі ў канцы XVIII стагоддзя

рускія дваране. Гэтым мастацтвам захапляліся вядомыя мастакі, яго выкарыстоўвалі ў кніжным афармленні. Магчыма, беларуская шляхта таксама аздабляла інтэр'еры сядзіб сілуэтнымі партрэтамі, але дакументальных звестак пра гэта не знойдзена. Затое дакладна вядома, што тагачасныя чыноўнікі выкарыстоўвалі кустодзіі – папяровыя выразкі для абароны васковых і сургучных пячатак, якія мацаваліся непасрэдна на дакуменце пад тэкстам, візуальна павялічваючы пячатку і падкрэсліваючы значнасць дакумента.

Як і выцінанка, кустодзія выраблялася з аркуша паперы, які звычайна складалі ў чатыры разы, потым фігурна наразалі краі. Яны мелі форму ромба або разеткі, маглі быць як вельмі сціплых абрысаў, так і з адмысловым малюнкам. Кустодзіі прысутнічаюць на дакументах XVII–XVIII стагоддзяў, на пачатку XIX стагоддзя трапляюцца зрэдку, бо ўжо выходзяць з ужытку. Таму казаць пра пераемнасць традыцыі не даводзіцца: пра кустодзіі ўжо забыліся, а пра выцінанку яшчэ не ведалі. Апошняя развівалася па сваіх законах.

– І звязана гэта было з пашырэннем папяровай прамысловасці, яе адноснай даступнасцю, з аднаго боку, і зменай інтэр'ера сялянскага жылля, запатрабаванасцю ў сродках дэкору, з другога, – расказвае навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі доктар мастацтвазнаўства, прафесар Яўген Сахута. – Курныя хаты выцясняюцца «чыстымі», узнікае жаданне іх аздабляць. Карункавыя вырабы, дэкаратыўныя тканіны – посцілкі, дываны – з'ява таго ж часу, у адрозненні ад ручнікоў, якія больш старажытныя. Новыя віды народнай мастацкай творчасці ажывілі сціплы ў дэкаратыўным плане інтэр'ер сялянскіх хат. Але саткаць посцілку ці пашыць што – працаёмкая справа, а тут аркуш паперы, нажніцы – і новыя фіранкі, абрусы на абразы да Калядаў ці Вялікадня гатовыя.

Ажурныя выразкі былі характэрны і для яўрэйскай культуры. Імі аздаблялі свяшчэнныя тэксты, а таксама віншавальныя карткі – шана това, шлюбныя кантракты – ктубы і іншае. Магчыма, тэхніку выразання з паперы беларускія сяляне якраз і пераналі ад местачковых яўрэяў.

***«Аркуш паперы, нажніцы – і новыя фіранкі, абрусы на абразы да Калядаў ці Вялікадня гатовыя».***

– У прынцыпе, гэта версія пераканаўчая: у мястэчках іх пражывала на той час да 60 працэнтаў ад ўсяго насельніцтва. Яўрэі трымалі лаўкі, гандлявалі ў тым ліку канцылярскімі таварамі, аздаблялі вокны выразкамі з белай паперы – райзэле. Папяровая выцінанка на акне магла выконваць ролю і ўпрыгожвання, і своеасаблівай камерцыйнай рэкламы, нават заходзіць не трэба, з вуліцы відаць, – лічыць Яўген Міхайлавіч.

Паводле слоў Сахуты, пазней, калі выцінанка трывала ўвайшла ў сялянскі побыт, хлопцы, праходзячы міма хаты, дзе жыла дзяўчына на выданні, таксама глядзелі на вокны: што там за папяровая фіранка – абы-якая, мухамі заседжаная ці новенькая, акуратная, і рабілі выснову, ці будзе толк з гаспадыні. Бо ў добрай гаспадыні, як расказвалі даследчыку народнай культуры падчас этнаграфічных экспедыцый старажылы Навагрудчыны, нават каля печы былі выразаны фіранкі.

**Яўген Сахута ўпэўнены: за тры дзесяцігоддзі беларуская выцінанка выйшла на высокі ўзровень і вартая таго, каб папоўніць сусветную скарбніцу каштоўнасцей**





**На захадзе Беларусі католікі ўпрыгожвалі выцінанкай разьбяныя алтарыкі**



**Пасля вайны ў вёсках згадалі пра папяровыя фіранкі і зноў узяліся за нажніцы**

На Гродзеншчыне ў католікаў распраўсюдзілася традыцыя аздабляць выцінанкай хатнія алтарыкі. Праваслаўныя ўпрыгожвалі папяровымі карункамі покуць – абразы, палічкі пад імі. Паўсюль выразалі папяровыя сурвэткі пад святочныя пірагі.

***«Моладзь, глядзіш, паяском падпярэжацца, капялюш саламяны надзене».***

Аднак панаванне выцінанкі ў беларускай хаце было адносна нядоўгім. У першай палове XX стагоддзя яна пачынае выходзіць з ужытку. Некаторы час пасля вайны, калі адраджаліся вёскі, традыцыя заставалася. Трэба было нечым прыкрыць вокны, аздобіць іх, вось і згадалі пра папяровыя фіранкі. Больш вопытныя майстрыхі амаль дакладна імітавалі гардзінныя тканіны, рабілі складкі на папяровых фіранках.

Сапраўным талентам лічылася ўменне выразаць нажом. На Навагрудчыне бытаваў характэрны мясцовы від выцінанкі – выбіванка. Узор высякалі вострым зубільцам ці плоска раскляпаным цвіком. У розных кутках Беларусі пасля вайны выкарыстоўвалі нават пустыя патронныя гільзы: недахопу іх у той час дакладна не было. Імі высякалі круглыя дзірачкі на шматразова складзеным аркушы паперы. Каб атрымаць адмысловыя ўзоры, краям гільзы надавалі фігурныя абрысы.

Традыцыя выцінанкі спарадычна доўжылася асабліва на захадзе Беларусі. У вясковых хатах сустракаліся фіраначкі, сурвэткі на палічках. Алтарык разьбяны мог быць упрыгожаны выцінанкай. Але такая творчасць ужо не мела масавага характару. Папяровыя дзівосы паступова знікалі з вясковага побыту, нагадваючы пра сябе хіба што сняжынкамі на вокнах на Новы год і Каляды. У такім выглядзе мы памятаем выцінанку, але наўрад ці хто з савецкіх дзяцей ведаў, што гэта менавіта ён, некалі папулярны ў народзе від дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Мой суразмоўца згадвае, што ў сваім пасляваенным дзяцінстве ён не бачыў ні папяровых фіранак, ні сурвэтак, у іх в. Вечатарова і ў суседніх вёсках

на Стаўбцоўшчыне ніхто не выцінаў. Пазнаёміўся з выцінанкай падчас даследаванняў народных мастацкіх рамёстваў. Яшчэ заспеў носьбітаў традыцый – ткачых, ганчароў і кавалёў. Апантана ездзіў у экспедыцыі па вёсках Беларусі, каб адшукаць, занатаваць і захаваць.

*«Традыцыйныя выцінанкі – сурвэткі, фіранкі – выконваюць толькі хіба што на выставу ці конкурс».*

У канцы 1980 – пачатку 90-х гадоў цікавасць да народнай культуры пачынае прыкметна ўзрастаць не толькі ў навуковым асяроддзі, але і ў грамадстве.

– Гэта звязана ў першую чаргу з набыццём краінай незалежнасці і самастойнасці: беларусы сталі больш задумвацца, чым мы адрозніваемся ад іншых народаў, чым вылучаемся, – разважае Яўген Міхайлавіч. – Раней посцілкі тканыя, што маці давала дзецям у горад, не лічыліся моднымі, у шафе пыліліся, а тут рэзка ўсё мяняецца. Моладзь, глядзіш, паяском падпярэжацца, капялюш саламяны надзене і ідзе, ганарыцца. Ужо не кажу пра жаданне за кросны сесці ці за ганчарны круг. За некалькі гадоў адрадзіліся практычна заняпалыя ці амаль забытыя віды традыцыйных рамёстваў. Выцінанка, вернутая фактычна з небыцця, усяго за нейкае дзесяцігоддзе апынулася ў шэрагу папулярных відаў народнай творчасці.

Трыумфальнае вяртанне выцінанкі, выпрацоўка адметнай стылістыкі і нацыянальных рысаў звязана ў тым ліку з творчасцю журналіста, пісьменніка і фатографа са Случчыны Вячаслава Дубінкі. Падтрымліваючы трыдыцыі землякоў, ён выразаў свае папяровыя дзівосы, тыя ўзоры, што запалі ў душу з дзяцінства. І, спалучыўшы мясцовыя традыцыі і ўласнае бачанне магчымасцей выцінанкі, здолеў узняць яе на вышыню сапраўднага мастацтва. Працяглы час Дубінка быў ці не адзіным слынным майстрам. Яго выцінанкі – творы станковага мастацтва, блізкія да графікі, выкарыстоўвалі ў афармленні кніг, дэманстравалі як унікальную з'яву на шматлікіх выставах. І ўвогуле для многіх сучасных майстроў сталі тым самым вектарам, які дапамог адшукаць ім свой шлях у творчасці.

Выцінанкі Вячаслава Дубінкі можна ўбачыць у музеі старажытнабеларускай культуры ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. Тут таксама знаходзіцца цікавая калекцыя, якую стварыў ў 1950–60-х гадах ксёндз М. Варанецкі з Ружанаў Брэсцкай вобласці. Хаця ў яго работах, як адзначае

**Выцінанкі Вячаслава Дубінкі захоўваюцца ў тым ліку ў музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі**





Яўген Міхайлавіч, шмат аматарскай самадзейнасці, каштоўнасць іх у тым, што захоўваюць мясцовыя традыцыі і сталі той нітачкай, што працягнулася да нашага часу. Ад яго тэхналогію ружанскай выразанкі пераняў зямляк, мастак Юрый Малышэўскі. Выраблядь арыгінальныя выцінанкі ён пачаў яшчэ ў 1980-х, адным з першых у Беларусі. Спалучэнне выцінанкі і сілуэтнага выразання надало яго творчасці яркую індывідуальнасць. Шмат гадоў Ю. Малышэўскі вядзе клас народнай творчасці для дзяцей, вучыць спалучаць асаблівасці мясцовай выцінанкі з уласным бачаннем прыгажосці.

***«Даводзіцца нават трошкі стрымліваць, каб цалкам не адыходзілі ад традыцыйных асноў».***

Адраджэнне выцінанкі ў Беларусі звязваюць таксама з імем вядомага народнага майстра Вікторыі Чырвонцавай з Маладзечна, з яе творчай і педагагічнай дзейнасцю на ніве традыцыйнай культуры. Яна заснавала маладзечанскую школу выцінанкі, вядомую ў Беларусі і за межамі краіны. На аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў музычным каледжы імя М.К. Агінскага, дзе выкладала Вікторыя Чырвонцава, выпрацоўвалася адметная, пазнавальная стылістыка. Работы мясцовых майстроў вылучаюцца высокай графічнай культурай, дызайнерскім падыходам, каларыстычным лаканізмам. І сёння выцінанка ў каледжы выкладаецца на высокім узроўні, як прадмет, на якім глыбока вывучаюць сусветнае і нацыянальнае мастацтва выразання.

## Пахваліцца на ўвесь свет

На пачатку 2000-х за паперу і нажніцы, здаецца, узяліся паўсюль, пачынаючы з дзіцячых садоў і школ. Ствараюцца гурткі і студыі ў дамах рамёстваў. З кожным годам усё больш ахвотных пазнаёміцца з гэтым відам дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Уласна, так пачынаўся сапраўдны трыумф выцінанкі. Нават Яўген Сахута, які даследаваў гэты працэс, папулярызаваў яго, лічыць, што гэта «проста нейкае дзіва, феномен, які адбыўся нечакана».

Секцыя выцінанкі ў Беларускім саюзе майстроў народнай творчасці спачатку аб'ядноўвала каля двух дзясяткаў чалавек. Сёння іх больш як 100. У 2000 годзе правялі першае рэспубліканскае свята-конкурс «Ажурныя фантазіі». Пачалі ладзіць абласныя фестывалі, якія збіраюць майстроў розных узростаў.

Без пяпяровых дзівосаў не абыходзіцца, бадай, ніводная больш-менш значная культурная падзея. «Выходзіць» выцінанка і на шырокі экран, і на тэатральную сцэну і канцэртныя пляцоўкі. Некалькі разоў Віцебскае абласное свята-конкурс «Ажур-





**Творы Вікторыі Чырвонцавай, заснавальніцы маладзечанскай школы выцінанкі. 1990-я гады**





З традыцыямі беларускай выцінанкі навучэнцаў дзіцячай школы мастацтваў г. Крычава знаёміць народны майстар Наталля Бярнадская

ныя мары» праводзілі на «Славянскім базары ў Віцебску», а аднойчы паводле матываў выцінанкі аформілі галоўную фестывальную сцэну. Мільёны тэлегледачоў ва ўсім свеце падчас трансляцый маглі назіраць за гэтым цудам.

Мы бачым выцінанку на вокладках кніг і віншавальных паштоўках, на запрашальных білетах і, урэшце, у рамцы пад шклом як каштоўны жывапісны ці графічны твор. Менавіта прафесійныя мастакі паступова ўзнялі яе да ўзроўню высокага мастацтва.

Вядома, сучасная выцінанка прыкметна адрозніваецца ад даўняшняй. Дзякуючы таленту беларускіх майстроў яна набыла новае дыханне.

– Яны падыходзяць да гэтага віду творчасці з іншых пазіцый, ствараюць такія складаныя кампазіцыі, якія пад сілу толькі прафесійным мастакам графікі, скульптуры. І даволі ліха і цікава гэта робяць, – канстатуе Яўген Сахута. – Традыцыйныя выцінанкі – сурвэткі, фіранкі – выконваюць толькі хіба што на выставу ці конкурс. Ёсць, канешне, народныя майстры, як Станіслаў Муліца з Гродна, які выразае тыя ж фіраначкі, аздобы пахавальныя і стараецца аднавіць іх амаль што ў аўтэнтычным выглядзе.

Паводле слоў Яўгена Міхайлавіча, цяпер выцінанка знаходзіцца на мяжы аматарства, народнага і прафесійнага мастацтваў. Аўтэнтычныя ці блізкія да іх выразанкі ствараюць, як правіла, майстры старэйшага пакалення. Другі кірунак атаясамліваюць з моладдзю, якая захапілася выцінанкай і арыентуецца на сучасныя дасягненні ў гэтай справе ці на ўласнае разуменне. Трэцяя плынь, якая пераважае ў колькасных і якасных адносінах, гэта прафесіяналы, арыентаваныя на станковае выяўленчае мастацтва.

***«Наша выцінанка вартая таго, каб папоўніць спіс нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва».***

– Шмат майстроў з яркай індывідуальнасцю, і ў кожнага свая стылістыка, – заўважае прафесар Сахута.

Найбольш выразна гэтую плынь прадстаўляюць майстры маладзечанскай школы выцінанкі. Адна з вядомых яе прадстаўніц – народны майстар, выкладчык Маладзечанскага каледжа Лізавета Чырвонцава. Нават тыя, хто асабліва не цікавіцца мастацтвам, ведаюць яе творы. Паводле выцінанак маладзечанскай мастачкі выканалі каванае аздабленне станцыі метро «Кавальская слабада». Іх выкарыстоўваюць у афармленні канцэртных залаў



**Выцінанка і педагогіка для Лізаветы Чырвонцавай – заняткі спадчынныя**

і сцэнічных пляцовак. Праразныя выцінанкавыя малюнкі ўдала спалучыліся і з тканінай – у Кацярыны Герасіменка атрымалася шыкоўная калекцыя дызайнерскага адзення. Мадэльер натхнілася «Дрэвам жыцця з аленямі», «Папараць-кветкай», «Людзьмі і дрэвам» і іншымі работамі Чырвонцавай.

Выцінанкі мастачкі можна ўбачыць у дызайне наручных гадзіннікаў, вулічных інсталяцый. Кранаюць «Жаночыя вобразы майго роду» – серыя работ, дзе сямейныя фотаздымкі арыгінальна, з філасофскім бачаннем спалучаюцца з выцінанкай. Зрэшты, гэта не проста сімволіка, а і праўда жыцця: педагогіка, народныя рамёствы і ўвогуле мастацтва – заняткі спадчынныя для Лізаветы і старэйшай сястры Наталлі. Яшчэ адна сястра Кацярына – медык, але таксама захапляецца выразаннем папяровых аздоб.

Іх маці Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава з таго пасляваеннага пакалення, што ўпрыгожвала хату папяровымі выстрыганкамі. Ці, дакладней, вырыванкамі. Нажніцы дома былі адны, імі выразалі старэйшыя браты, а малодшыя дзеці мачылі рукі і стараліся акуратна вырываць папяровыя ўпрыгожванні.

– Матуля любіла шыць і вышываць. Думаю, тэкстыль і лялькі больш блізкія ёй па душы: рабіла для іх касцюмы, беларускія строі, кожную дэтальку прадумвала дасканала, – згадвае Лізавета. – Але і выцінанкі ў яе былі вельмі цікавыя, і не скажу, што надта традыцыйныя. Наадварот, даволі смелыя на той час, з наватарскім падыходам да формы.

Маці вучыла іх нетрафарэтнаму падыходу і таму, чым сама добра валодала: уменню перадаць у работах свае адчуванні і эмоцыі. А таксама карпатліва і дасканала працаваць з любым матэрыялам, нават самым звычайным.

– Матуля казала: у народным дэкаратыўным мастацтве ўсё робіцца з даволі простых матэрыялаў – саломы, паперы, ільну. І трэба падысці так, каб матэрыял не замінаў, каб бачылі не яго, а толькі твор, – расказвае Лізавета Чырвонцава.

**Каванае аздабленне станцыі метро «Кавальская слабада» выканалі паводле выцінанак Лізаветы Чырвонцавай**





**Дызайнер Кацярына Герасіменка, ствараючы калекцыю адзення, удала спалучыла праразныя выцінанкавыя малюнкі з тканінай**



Лізавета Чырвонцава ў 2018 годзе стварыла праект «Жаночыя вобразы майго роду», у ім сямейныя фотаздымкі арыгінальна ўпрыгожаны выцінанкай

Сапраўды, што ўжо можа быць больш простым, чым папера, а работы такія, што вачэй не адвесці. Цэлыя серыі вытанчанай прыгажосці рознай тэматыкі – міфалагічнай, сакральнай, анімалістычнай. У кожным творы ювелірнасць распрацоўкі сюжэта, дасканаласць, якая захапляе і ўражвае. Міжволі разумееш: матчын запавет Лізавета выканала. Хаця напачатку, у мастацкай школе, не лічыла выцінанку сур'ёзнай справай:

– Занятак цікавы: складаеш, выразаеш, разварочваеш, а там – ах, цуд, хуткі і нечаканы. Але мне здавалася гэта занадта проста.

На факультэце народных рамёстваў у Беларускім універсітэце культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў) Лізавета Чырвонцава стала першай ў галіне выцінанкі, а яе дыпломны праект «Кола жыцця» паводле матываў народнага календара зрабіў сенсацыю.

У Маладзечанскім музычным каледжы яна працягвае ўдасканальваць сваё майстэрства, дбайна захоўвае традыцыі і натхнёна вучыць моладзь любіць народнае мастацтва і выцінанку так, як любіць яна сама. Адзначае, што найбольшую цікавасць да выразанкі маюць навучэнцы, якіх вабіць малюнак, графічныя формы. Яны не баяцца эксперыментаваць і рэалізоўваць наватарскія ідэі.

Кіраўнік клуба майстроў народнай творчасці «Каляровая альтанка» Наталля Клімко з Навагрудка захоўвае мясцовую традыцыю выцінанкі-выбіванкі, якая ў 2014 годзе ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі. На здымку: Наталля Клімко са сваёй паслядоўніцай Аленай Шульга









Творы народнага майстра Станіслава Муліцы з Гродна адметныя рэгіянальнай пазнавальнасцю, сувяззю з мясцовымі традыцыямі народнай культуры

– Даводзіцца нават трошкі стрымліваць, каб цалкам не адыходзілі ад традыцыйных асноў, не сышлі ў графічную стадыю, калі твор атрымліваецца больш як станковае мастацтва, а не традыцыйная выцінанка, – усміхаецца Лізавета.

Педагог і творца імкнецца пераканаўча давесці моладзі пра народныя традыцыі, на якіх трымаецца беларуская выцінанка, і растлумачыць, як важна захаваць менавіта сваё роднае, што сілкуе, гоіць і натхняе. Што стварае нашу гістарычную памяць і вызначае нас як народ, нацыю, чым можам з гонарам пахваліцца ўсяму свету.

Дачка Лізаветы Чырвонцавай Сафія таксама скончыла сталічны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. І, як маці, тэмай для дыпломнай работы абрала выцінанку. Чым не пераемнасць і працяг традыцыі?!

Зрэшты, не толькі Маладзечна славіцца майстрамі выцінанкі. Яшчэ і Віцебшчына з непаўторнымі творамі Алесі Талерчык, Алены Ходзікавай, Таццяны Лабуновай, Таццяны Петух, Людмілы Гаравой, Галіны Жураўлёвай і іншых. Выразнай творчай манерай і характэрным аўтарскім почыркам вызначаюцца Юрый Малышэўскі, Святлана Вяль, Ніна Міхайлава, Марына Марчук, Наталля Кулецкая з Брэстчыны. Цікавы стылістычны кірунак выцінанкі распрацоўвае Святлана Лункевіч-Адамовіч з Магілёўшчыны. Яна выкладае ў абласным каледжы мастацтваў і мае ўжо шмат паслядоўнікаў, сярод якіх і Наталля Бярнадская з Крычава. Характэрным народным каларытам прываблiваюць выцінанкі Станіслава Муліцы і Аляксандра Аўчыннікава з Гродна і Наталлі Клімко з Навагрудка. Вядучым майстрам выцінанкі на Гомельшчыне заслужана лічаць Юлію Каўрус. Яна прадстаўніца маладзечанскай школы выцінанкі, а з пераездам на Палессе зацікавілася матэрыяльнай і мастацкай культурай палешукоў. Можна вылучыць арыгінальныя творы сталічных майстроў Наталлі Сухой, Алены Шаліма, Наталлі Гамаюнавай, Валянціны Слюнчанка, Таццяны Маркавец. Зрэшты, пералічыць усіх досыць складана.

– З іх творчасці складаецца своеасаблівая мазаіка сучаснай беларускай выцінанкі, якая за тры дзесяцігоддзі выйшла на такі ўзровень, што мы вырашылі: хопіць чакаць з нашай сціпласцю, наша выцінанка вартая таго, каб папоўніць Спіс нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва, – заяўляе Яўген Сахута.

І сапраўды, чаму б не?! Сучасная беларуская выцінанка – выбітная мастацкая з’ява ў нацыянальнай культуры. Гэта ўжо даўно не ўтылітарны прадмет, а высокай вартасці твор, які пры ўсіх сучасных тэндэнцыях і творчых аўтарскіх памкненнях не адышоў ад сваёй асновы – народнай культуры і традыцый.

*Ганна МАСЛЯКОВА*
*Фота з архіваў БЕЛТА, Яўгена САХУТЫ, Лізаветы ЧЫРВОНЦАВАЙ і з адкрытых крыніц*